*А.І.Смолік*
(Мінск)

# Краязнаўчая дзейнасць Яўстафія і Канстанціна Тышкевічаў

У XIX ст. у Беларусі заметна актывізавалася дзейнасць па вывучэнні духоўнай і матэрыяльнай культуры пэўных рэгіёнаў края. На пашырэнне краязнаўства значны ўплыў зрабілі Віленская археалагічная камісія, Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута, Віленскі музей старажытнасцей, Паўночна-Заходні аддзел Рускага геаграфічнага таварыства. Краязнаўча-археалагічныя матэрыялы друкаваліся ў перыядычных выданнях і зборніках, што выдаваліся ў Пецярбургу, Маскве, Вільні, Кіеве, Варшаве, Кракаве і інш. Вывучэнню асобных рэгіёнаў Беларусі прысвяцілі свае працы М.І.Балінскі, З.Я.Даленга-Хадакоўскі, А.К.Кіркор, Ю.І.Крашэўскі, М.Ф.Кусцінскі, Т.Я.Нарбут, А.Ф.Рыпінскі, І.А.Сербаў і інш.

Браты Тышкевічы таксама былі захоплены вывучэннем роднага краю, асабліва знаёмага з дзяцінства Барысаўскага павета. З дапамогай краязнаўцаў-актывістаў К.Адамовіча, П.Чачота, М.Чарноцкага, В.Чаховіча, В.Твардоўскага, Я.Ваньковіча, Ю.Тышкевіча, К.Тышынскага, В.Гарноўскага і іншых даследчыкаў Я.Тышкевіч стварыў грунтоўнае апісанне Барысава і Барысаўскага павета. Кніга “Апісанне Барысаўскага павета” дае падрабязныя звесткі па тых прадметах, на якія звярталі ўвагу былыя статыстычныя праграмы [5]. К.Тышкевіч у пісьме да Плацыда Янкоўскага даволі канкрэтна ўказвае, хто быў асноўным аўтарам “Апісання Барысаўскага павета”: “Брат Яўстах напісаў для статыстычнага камітэта гісторыю горада і цэлага Барысаўскага павета, якая хутка павінна з’явіцца ў друку” [2, с. 47]. Для гэтай кнігі Тышкевіч некалькі гадоў збіраў першакрыніцы па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, літаратуры, мастацтве, тапаніміцы, фальклоры. Амаль 10

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гадоў даследчык ствараў унікальную краязнаўчую працу, дзе кожны факт, кожная дата выверaны, добрасумленна прааналізаваны і аргументаваны.

У гэтай жа кнізе Я.Тышкевічам дадзены гістарычныя звесткі пра Смалявічы, Зембін, Плешчаніцы і інш. Нарыс пра Лагойск, як і пра Барысаў, займае адметнае месца, аўтарства належыць не Я.Тышкевічу, а яго брату Канстанціну. Праца Я.Тышкевіча "Апісанне Барысаўскага павета" па заслугах ацэнена Я.Карскім, А.Пыпіным і інш. Н.Гілевіч этнаграфічную частку работы назваў адным з лепшых дасягненняў у даследаванні быту і творчасці беларускага сялянства [3, с. 80].

У сваёй навуковай дзейнасці Я.Тышкевіч вялікую ўвагу надаваў збору, вывучэнню і выданню старадаўніх грамат, актаў і мемуараў. У 1872 г. у Кракаве па яго ініцыятыве быў выдадзены гадавік для археолагаў, нумізматаў, бібліёграфаў. Тут была змешчана яго праца "Археалогія ў Літве", дзе акрэслена даволі шырокае кола помнікаў, якое патрэбна даследаваць яго спадкаемцам [2, с. 48].

У 1843 г. Я.Тышкевіч зрабіў паездку па краінах Скандынавіі, пабываў у Хельсінкі, Стакгольме, Капенгагене. Працаваў у сталічных архівах і бібліятэках, дзе яму ўдалося адшукаць шмат новых матэрыялаў па гісторыі сярэдневяковай Польшчы і Беларусі. Пашчасціла выявіць творы графікі сваіх землякоў, імёны якіх былі невядомыя. Ён склаў своеасаблівы рэестр знаходак. Малады навуковец не раз сустракаўся з кампетэнтнымі спецыялістамі. Я.Тышкевіч выявіў невядомыя дагэтуль падрабязнасці пра ваенны паход караля Карла XII па Беларусі, дзе фігуравалі знаёмыя геаграфічныя назвы: Гродна, Пінск, Клецк, Нясвіж, Слуцк, Навагрудак, Менск, Смілавічы, Крэва, Смаргонь, Суботнікі, Трабы, Гальшаны, Маладзечна, Радашковічы, Ігумен, Бялынічы, Галоўчын, Магілёў, Лясная. Гэта быў вадатны матэрыял для даследчыкаў гісторыі вайны. Вынікам той паездкі за мяжу стала своеасаблівая "справаздачная" кніга "Лісты пра Швецыю" [2, с. 23].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Яго брат, краязнавец К.Тышкевіч збіраў звесткі па гісторыі Лагойска, Астрашыцкага Гарадка і іншых населеных пунктаў, але найважнейшай працай у гэтым плане з’яўляецца “Вілія і яе берагі”, якую ён завяршыў у 1858 г. [6]. Кніга выйшла ў свет у 1871 г. у Дрэздэне на польскай мове і з’яўлялася адзінай у Еўропе манаграфіяй, дзе этнічны рэгіён даследаваны шляхам падарожжа па рацэ. Да таго былі вядомы толькі апісанні Дуная, Рэйна і Тэмзы [4, с. 2]. Кніга аздоблена графічнымі малюнкамі Артура Бартэльса, якія ён выконваў з натуры ў час сумеснага падарожжа па Віліі, што робіць манаграфію больш каштоўнай. Лагойскія скарбы знаходак і архіў вучонага дасталіся яго сыну Аскару Тышкевічу.

Пры рабоце над манаграфіяй “Вілія і яе берагі” К.Тышкевіч выкарыстаў вопыт апісання Дуная, Рэйна, Тэмзы, а таксама вопыт мясцовых краязнаўцаў М.Борха, І.Ходзькі, С.Мураўскага. Была яму знаёма і неапублікаваная праца па гідраграфіі рэк Беларусі і Літвы Ходзькі, рукапіс якой знаходзіўся ў Віленскай археалагічнай камісіі. Перад тым як адправіцца ў падарожжа па Віліі, даследчык прасіў сваіх знаёмых прасачыць звесткі па гісторыі мястэчак, пра помнікі даўніны.

К.Тышкевіч паклаў пачатак вывучэнню старажытных гарадоў Лагойска, Заслаўя, іх старадаўняга будаўніцтва. Упершыню ў краязнаўчую практыку на Беларусі К.Тышкевіч увёў складанне тапаграфічных планаў замкаў і гарадзішчаў. Так, ім былі зроблены планы замкаў у Заслаўі, Чашніках, Уле, Біржах, Лагойску, Рудніку, Свідне, Дабрынёве, Баравым Млынку, Сукромне. Навуковая каштоўнасць такіх картаграфічных планаў відавочная, паколькі фіксуецца стан помнікаў да раскопак і пасля, як гэта бачна на прыкладзе Лагойска і Заслаўя. Аўтар падмацоўвае свае назіранні малюнкамі аб’ектаў. Метад К.Тышкевіча быў падхоплены іншымі археолагамі, у прыватнасці А.Кіркорам і У.Сыракомляй. Пазней малюнкі планаў сталі проста неабходнымі пры раскопках. Такія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спробы фіксацыі помнікаў першым на Беларусі рабіў і З.Даленга-Хадакоўскі, але яго малюнкі-планы больш чым на стагоддзе былі пахаваны ў архіве.

Працуючы ў галіне археалогіі, этнаграфіі і краязнаўства, Тышкевічы займаліся і вывучэннем фальклору. Імі апісаны многія вясельныя абрады, святочныя рытуалы Каляд, Радуніцы, Спаса, Дзядоў і ўсяго цыкла гаспадарчага гадавога календара беларусаў. Многія з іх знайшлі адлюстраванне ў раздзеле “Вясельныя абрады сельскага люду ў Мінскай губерні Барысаўскага павета з-пад Бярэзіны”, які з’яўляецца часткай кнігі “Апісанне Барысаўскага павета”. У сваіх навуковых запісках яны імкнуліся выявіць і растлумачыць язычніцкія абрады, элементы якіх захаваліся і ў хрысціянскіх вераваннях. Апісваючы народныя ўрачыстасці, Яўстафій Тышкевіч адзначаў, што багатае духоўнае жыццё селяніна часта не супадала з матэрыяльным. Я.Тышкевіч сабраў і апрацаваў каля 450 беларускіх прымавак і прыказак. Падборкі іх з каментарыямі вучоных ён неаднаразова змяшчаў у часопісе “Biblioteka Warszawska”. Трапнымі беларускімі прымаўкамі, прыказкамі, легендамі і паданнямі краязнаўца праілюстраваў сваю кнігу “Узоры хатняга сумеснага жыцця ў Літве” (1864), дзе выклаў свае погляды на культуру шляхты ранейшых стагоддзяў.

Шмат цікавых гістарычных матэрыялаў змешчана ў кнізе Я.Тышкевіча “Нашы краі” і працы “Археалагічныя даследаванні помнікаў мастацкіх рамёстваў і да т.п. у старажытнай Літве і Літоўскай Русі” (1850).

Яўстафій і Канстанцін Тышкевічы сваёй падзвіжніцкай працай зрабілі значны эмпірычны і тэарэтычны ўклад у развіццё беларускай краязнаўчай думкі, з’яўляліся прызнанымі вучонымі свайго часу, былі абраны ганаровымі членамі як айчынных, так і замежных акадэмій і навуковых таварыстваў. Сучасныя беларускія гісторыкі, этнографы, філолагі, фалькларысты карыстаюцца пажоўклымі ад часу кнігамі-рарытэтамі і як даследчыкі судакранаюцца з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рукапіснай спадчынай славутых вучоных. Грунтоўнае знаёмства з навуковай і культурна-асветніцкай дзейнасцю братоў Тышкевічаў пераконвае нас ў тым, што яны сцвярджалі ў грамадстве важную думку пра нацыянальную самабытнасць і гістарычную непаўторнасць Беларусі і тым самым неўсвядомлена рыхтавалі глебу для беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

---

1. *Каханоўскі, Г.А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX стст. / Г.А.Каханоўскі. – Мн., 1984.

2. *Каханоўскі, Г.А.* Руплівец нашай старасветчыны. Яўстах Тышкевіч / Г.А.Каханоўскі, А.Г.Каханоўскі. – Мн., 1992.

3. *Марціновіч, А.* Ля агню даўніны: [пра заснаванне Віленскага музея старажытнасцей] / А.Марціновіч // Беларуская мінуўшчына. – 1996. – № 6.

4. *Тышкевич, К.* О курганах в Литве и Западной Руси / К.Тышкевич. – Вильня, 1865.

5. *Tyszkiewicz, Hr. Eustachy.* Opisanie powiatu Borysowskiego pod względem statystycznym, gospodarczym, premysłowo-handlowym / E.Tyszkiewicz. – Wilno, 1847.

**6. Tyszkiewicz, Hr. Konstanty.** ***Wilija i jej brzegi / K.Tyszkiewicz. – Vilnius, 2008.***

*М.Нароўская*
(Мінск)

## Гравюры ў мастацкай калекцыі К. і Я.Тышкевічаў

Узнікненне такога арыгінальнага мастацкага твора, як гравюра, на тэрыторыі Беларусі звязана з дзейнасцю першадрукара і асветніка-гуманіста Францыска Скарыны. Раннія дрэварыты зафіксаваны ў выданнях вучонага. 6 жніўня 1517 г. выйшла яго першая друкаваная кніга “Псалтыр”. Яна з’яўляецца не толькі пачаткам кнігадрукавання, але і з’яўленнем новага віду беларускага мастацтва – кніжнай ксілаграфіі [1, с. 241–242].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Станковая графіка ў параўнанні з кніжнай атрымала ў разглядаемы перыяд меншае развіцце. Асноўным відам станковай графікі быў графічны партрэт, распаўсюджанне якога ў параўнанні з жывапісам у мастацтве Вялікага княства Літоўскага было досыць шырокім [6, с. 43]. З літаратурных крыніц вядома аб існаванні партрэтаў Жыгімонта Старога і яго жонкі Боны 1521 г., выкананых у тэхніцы гравюры.

У XVI–XVIII стст. гравюра на метале становіцца заняткам для арыстакратаў і асоб каралеўскіх фамілій Еўропы. Гравіраванне на метале – гэта выразанне паглыбленых ліній на меднай ці цынкавай пласцінцы пры дапамозе рэжучых інструментаў. Друкаваны адбітак, пры якім фарба з паглыбленняў пераходзіць на паперу, называецца гравюрай. Для гравіравання на метале мастак павінен быў цудоўна маляваць. Італьянцы Батычэлі і Мантэнья, немцы Альбрэхт Дзюрэр і Лукас Кранах вядомыя як вялікія майстры малюнка. Лепшыя старажытныя выданні Бібліі таксама ўпрыгожаны ілюстрацыямі ў тэхніцы разцовай гравюры.

У калекцыях беларускіх магнатаў была вялікая колькасць твораў гэтых замежных майстроў, а таксама Леанарда да Вінчы, Паола Веранезе, Пітэра Брэйгеля, Альбрэхта Дзюрэра і інш.

Разам з тым у першай палове XIX ст. у мастацкім жыцці беларускіх зямель праяўляецца новая тэндэнцыя – з’яўленне цікавасці да нацыянальнага мастацтва. Тлумачыцца гэта перш за ўсё значнымі поспехамі мастакоў віленскай школы ў гэты перыяд, а таксама ўзнікненнем устойлівай цікавасці лепшых прадстаўнікоў сацыяльных вярхоў былога Вялікага княства Літоўскага да сваёй культуры.

Важнейшую ролю ў гэтым працэсе адыграла Віленская школа жывапісу – аддзяленне прыгожых мастацтваў факультэта літаратуры і мастацтва Віленскага універсітэта. Яна была заснавана ў канцы XVIII ст. першым прафесарам жывапісу Беларусі і Літвы Ф.Смуглевічам і яго вучнямі. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачатку XIX ст. ва універсітэце была адчынена таксама кафедра графікі. У Віленскім універсітэце выкладалі Я.Рустэм, выдатны мастак, педагог; былы каралеўскі скульптар А.Лебрэн, яго вучань, ураджэнец Гарадзеншчыны К.Ельскі, выдатны графік і мастацтвазнавец англічанін Дж.Саўндэрс. За 35 гадоў сваёй работы школа падрыхтавала больш за 250 мастакоў, гравёраў, скульптараў. Выхаванцамі аддзялення прыгожых мастацтваў былі выдатны партрэтыст, майстар гістарычных кампазіцый Я.Дамель, мастак-партрэтыст еўрапейскага ўзроўню В.Ваньковіч, графік і мастак В.Дмахоўскі і інш. Галерэю вобразаў беларускіх помнікаў гісторыі і архітэктуры, краявідаў пакінулі вучні Я.Рустэма – выдатныя мастакі М.Кулеша і Н.Орда. Майстар батальнага жанру Я.Сухадольскі пакінуў серыю работ, прысвечаных вайне 1812 г. і паўстанням.

У стылістычным плане дамінуючая роля належала класіцызму. У тэхнічным плане, акрамя традыцыйных тэхнічных прыёмаў жывапісу, металаграфікі, з’явілася новая тэхніка – літаграфія, якая дазваляла працаваць у шырокім дыяпазоне колераў. Акрамя таго, акварэль і малюнак, якія перад гэтым выконвалі падрыхтоўчую функцыю для будучых жывапісных твораў, набылі самастойную каштоўнасць.

Як адзначае В.П.Грыцкевіч, калекцыі мастацкіх каштоўнасцей ў XIX ст. былі ў большасці родавых гнёздаў беларускай шляхты [2, с. 133]. Калекцыі гравюр былі ў палацах усіх магнацкіх родаў – Радзівілаў, Гутэн-Чапскіх, Тызенгаўзаў, Агінскіх, Тышкевічаў. Прадметам гонару Сапегаў – уладальнікаў Ружанскага палаца – таксама была выдатная падборка старажытных гравюр [3, с. 19]. Уладальнік Шчорсаў І.Храптовіч меў каля 7 тыс. карцін і гравюр мясцовага і замежнага вырабу. Колькасць рэдкіх гравюр А.Ельскага перавышала 2 тысячы [4, с. 114–117].

Крыніцы папаўнення калекцый былі разнастайныя. Паводле даследаванняў Г.Калантая, зборы фарміраваліся найперш з уласных сямейных рэліквій, падарункаў, шляхам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абмену з мясцовымі і замежнымі калекцыянерамі, шмат унікальных гравюр проста набывалася.

У магнацкіх і шляхецкіх маёнтках працавала нямала мастакоў-гравёраў. Ёсць звесткі, што многія таленавітыя гравёры жылі ў Нясвіжы і яго ваколіцах. Напрыклад, выдатны мастак і гравёр XVI – пачатку XVII ст. Тамаш Макоўскі – аўтар шматлікіх выдатных работ. Ён пры двары Радзівілаў у пачатку XVII ст. некаторы час узначальваў друкарню ў Нясвіжы. Па заказу Мікалая Радзівіла Сіроткі ён стварыў поўную і дакладную карту Вялікага княства Літоўскага, якую ў 1613 г. надрукавалі ў Амстэрдаме ў майстэрні Г.Гертыса на чатырох вялікіх аркушах. Гэта унікальнае для свайго часу выданне. Тамаш Макоўскі з'яўляецца таксама аўтарам гравюр з планам Масквы, краявідамі Вільні, Клецка, Трокаў, Смаленска і іншых старажытных гарадоў. Ёсць звесткі і аб наведванні і пражыванні ў палацы Лагойска знакамітага мастака-графіка Напалеона Орды.

Для нашага даследавання цікавасць уяўляе мастацкі збор К. і Я.Тышкевічаў, які размяшчаўся ў двух спецыяльна адведзеных для гэтай мэты залах палаца ў Лагойску. Асобна вылучалася калекцыя гравюр, якая падзялялася на дзве часткі. Першая ўключала адбіткі, выкананыя ў XVIII–XIX стст., на рэлігійныя тэмы, другая – партрэты гістарычных асоб, сярод якіх знаходзіўся славуты партрэт Т.Касцюшкі. У абедзвюх частках калекцыі змяшчаліся як творы невядомых мясцовых гравёраў, так і майстроў з Польшчы, Англіі і Францыі. К.Тышкевіч аддаў шмат сіл і часу на стварэнне гэтай калекцыі і ў 1858 г. апублікаваў каталог гравюр, які ўтрымліваў багаты матэрыял для беларускай іканаграфіі. Аб наяўнасці вялікай колькасці гравюр сведчыць і той факт, што Яўстах Тышкевіч пры стварэнні Віленскага музея старажытнасцей перавез у Вільню звыш 1000 гравюр.

У другой палове XVII ст. у царкоўнай графіцы з'явілася новая тэхніка – гравюра на метале. Першыя адбіткі былі выкананы на аснове арыгінальных гравіраваных дошак

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вялікіх майстроў. Пэўная частка гравіраваных дошак гэтага перыяду, створаная ў майстэрні Кіева-Пячорскай лаўры, трапіла ў XIX ст. у лагойскую калекцыю братоў К. і Я.Тышкевічаў, якая спачатку экспанавалася ў Лагойскім музеі, а з 1856 г. у Віленскім музеі старажытнасцей.

Такім чынам, калекцыя К. і Я.Тышкевічаў утрымоўвала унікальныя гравюры айчынных і замежных мастакоў. У 1858 г. К.Тышкевіч выдаў альбом з адбіткамі гравюр "Помнікі айчыннай гравюры". Частка гравіраваных дошак з лагойскай калекцыі сёння знаходзіцца ў зборы Нацыянальнага музея ў Варшаве.


1. *Гісторыя* беларускага мастацтва. Ад старажытных часоў да другой паловы XVI стагоддзя: у 6 т. – Мн., 1987.

2. *Грицкевич, В.П.* История музеев мира / В.П.Грицкевич. – Мн., 2003.

3. *Гужалоўскі, А.А.* Нараджэнне беларускага музея / А.А.Гужалоўскі. – Мн., 2001.

4. *Кісялёў, У.М.* Даследчык роднага краю / У.М.Кісялёў, А.І.Варыкіш // Адукацыя і выхаванне. – 1994. – № 7.

5. *Український* археографічний щорічнік. Т. 5. – Киев, 1993.

6. *Червонная, С.* Искусство Литвы / С.Червонная, К.Богданас. – Л., 1972.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ